УДК 821.161.3(072)

# УРОК ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ І ТВОРЧАЯ РАБОТА Ў КАНТЭКСЦЕ СІСТЭМЫ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ ЛІНІЙ (VIII КЛАС, ДРУГІ БЛОК УРОКАЎ)

**Аўтар:** Макарэвіч Алесь Мікалаевіч, загадчык кафедры беларускай літаратуры.

**Кантактная інфармацыя:** olekmak@mail.ru.

**Апісанне:** *Прадстаўлена характарыстыка этапаў, формаў і змест падрыхтоўчай і непасрэднай работы па вывучэнні лірыкі С. Дзяргая на ўроку па творах для дадатковага чытання ў восьмым класе ў кантэксце сістэмы перспектыўных ліній (другі блок урокаў).*

**Description:** *There are characteristics of stages, forms and content of preparatory and actual work directed at studying the lyris by S. Dergai at the supplementary reading lessons in the 8th form with the context of prospect lines (the second block of lessons).*

**Галіна прымянення распрацоўкі:** Адукацыя.

**Укараненне (запланаванае) распрацоўкі:** укараненне распрацоўкі ў вучэбны працэс установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», у працэс перападрыхтоўкі педагагічных кадраў ва ўстанове адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны абласны інстытут развіцця адукацыі» у 2014 г.

**Асноўныя перавагі распрацоўкі:** Арганізацыя працы настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній адпавядае сучасным інавацыйным працэсам у галіне агульнай сярэдняй адукацыі. Прапанаваная методыка працы (разам з метадычнымі распрацоўкамі аўтара для V-VII класаў) грунтуецца на засваенні матэрыялу літаратурных твораў у праекцыі на комплекснае выкананне заданняў да ўрокаў па вывучэнні твораў для дадатковага чытання і творчых работ, фарміраванне ўменняў у адносінах да бліжняй, сярэдняй і дальняй перспектыў навучання і выхавання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

Арганізацыя працы настаўніка і вучняў па сістэме перспектыўных ліній (далей – СПЛ) адпавядае сучасным інавацыйным працэсам у галіне сярэдняй адукацыі. Прапанаваная методыка працы па гэтай сістэме [6] грунтуецца на вывучэнні літаратурных твораў у кантэксце блокаў урокаў, калі паралельна з засваеннем твораў для чытання і вывучэння, для чытання і абмеркавання адначасова здзяйсняецца падрыхтоўка вучняў да ўспрымання і характарыстыкі твораў для дадатковага чытання, а таксама падрыхтоўка школьнікаў да выканання творчых работ. Такі падыход да працэсу выкладання літаратуры спрыяе эфектыўнай і рацыянальнай арганізацыі метадычнай працы настаўніка, калі ён выразна бачыць, асэнсоўвае і, адпаведна, плануе перспектывы навучання, а таксама паэтапна і комплексна арганізуе іх здзяйсненне.

У сувязі з адзначаным вышэй прапануем наступную структуру і змест другога блока ўрокаў у VIII класе па сістэме перспектыўных ліній.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Урокі № 11 – 25**[1]: лірычныя жанры (раздзел "Голасам душы і сэрца" з вучэбнага дапаможніка для восьмага класа) [5, с. 101-140]. Урок № 24 (урок па творах для дадатковага чытання, далей – УДЧ): С. Дзяргай. Вершы са зборніка «Чатыры стыхіі». Урок № 25 (урок падрыхтоўкі і выканання творчай работы, далей – УТР): пісьмовы водгук «Маё ўспрыманне лірычных твораў».

Змест гэтага блока вызначаецца выхадам на тэарэтычныя паняцці, адпаведныя ім мастацкія з'явы (лірыка як род літаратуры, яе жанры; лірычны герой; маналагічная форма лірычных твораў, вобразна-выяўленчыя сродкі паэтычнай мовы і інш. [2, с. 50]); характарыстыка тэарэтычных паняццяў і адпаведных ім мастацкіх з'яў (урокі №№ 11 – 25) дазваляе здзяйсняць выхад на элементы параўнальнай характарыстыкі літаратурных вобразаў, мастацкіх асаблівасцей твораў (УДЧ), а таксама рыхтаваць і праводзіць абгрунтаваны і доказны водгук на прачытаны твор (УТР). Вызначанае вышэй садзейнічае фарміраванню эстэтычнага густу васьмікласнікаў у працэсе ўспрымання імі лірычных твораў і іх ацэнкі.

Лірыка С. Дзяргая прадстаўлена ў зборніку «Чатыры стыхіі» (1988), які рэкамендаваны для вывучэння на УДЧ [2, с. 54]. Вершы паэта васьмікласнікі могуць знайсці таксама на інтэрнэт-старонцы, дзе прадстаўлены творы для вывучэння на гэтым этапе атрымання агульнай сярэдняй адукацыі [7]. Вершы С. Дзяргая не ствараліся як творы для дзяцей, але некаторыя з іх можна аднесці да кола дзіцячага чытання; частка з іх прыдатная для вывучэння на УДЧ. Вучняў можа зацікавіць тэматыка вершаў гэтага паэта (інтымная, філасофская, грамадзянская), праблематыка (праблема жыццёвых выбараў, адданасці ў каханні і інш.). Прычыны, па якіх з прадстаўленага ў вучэбнай праграме «Прыкладнага спісу твораў для дадатковага чытання» аддадзена перавага зборніку С. Дзяргая «Чатыры стыхіі», наступныя.

Па-першае, вершы з гэтага зборніка выразна ілюструюць праблематыку, мастацкія асаблівасці тых груп лірычных твораў, якія вывучаюцца ў кантэксце гэтага блока ўрокаў.

Па-другое, падрыхтоўка вершаў С. Дзяргая да выразнага чытання, а таксама сістэмнай характарыстыкі на УДЧ дазваляе замацаваць набытыя вучнямі ўменні выразнага чытання лірычных твораў на памяць і адпаведнай іх характарыстыкі.

Па-трэцяе, лірыка – тая частка мастацкай літаратуры, якая, на жаль, найменей адпавядае чытацкім інтарэсам сучасных школьнікаў. Таму важным з'яўляецца комплекснае вывучэнне гэтай часткі прыгожага пісьменства з тым, каб засяродзіцца на выяўленні яе спецыфікі (напр., інтымная, філасофская, пейзажная і інш.; лірыка аднаго аўтара і інш.)[2]. Вобразная сфера і форма прапанаваных ніжэй для вывучэння твораў С. Дзяргая спрыяюць фарміраванню ўменняў распрацоўкі партытуры лірычных твораў, падрыхтоўкі іх да выразнага чытання-дэкламацыі і на падставе гэтага – характарыстыцы адпаведных твораў. У выніку вучні змогуць выяўляць, асэнсоўваць, характарызаваць адпаведныя вобразна-выяўленчыя сродкі, а затым (ужо ў працэсе падрыхтоўкі творчай работы) – самастойна ствараць вобразныя выказванні, характарыстыкі лірычнага твора ў *пісьмовым* водгуку на яго (ці на сукупнасць твораў паводле тэматыкі і праблематыкі).

Для чытання і абмеркавання можна прапанаваць наступныя вершы С. Дзяргая. Грамадзянская лірыка: «На былым Мінскім напрамку», «Родная мова»; філасофская лірыка: «Сапраўднае», «Словы», «Мысль і слова», «Не плач

---

[1] Прапанаваная нумарацыя ўрокаў разыходзіцца з нумарацыяй прыкладанага каляндарна-тэматычнага планавання (далей – ПКТП) на два пункты ў сувязі з тым, што ў ПКТП у адносінах да ўрокаў №№ 1 – 8 не ўлічаны: а) урок па творы для дадатковага чытання, б) урок творчай работы.

[2] ПКТП прапануе вынесці на УДЧ у кантэксце вывучэння лірычных жанраў у восьмым класе творы "Вечар на захадзе ў попеле тушыць..." М. Багдановіча, "Над зямлёю шугае верасень" В. Зуёнка, "Чатырохгранная ваза" А. Наўроцкага, "Шарая гадзіна" П. Верлена, "Да Нёмана" А. Міцкевіча і інш. "*з кнігі для пазакласнага чытання «Ад роднае зямлі»*" [1, с. 64-65].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ніколі…», «Твой камень», «Корань дрэва вада поіць...», «Бывае, сум агорне, змога…»; інтымная лірыка: «Чаканне», «Бура», «Прабач», «Ад пралескі да бэзу»; пейзажная лірыка: «Восень», «Арабінка», «Сонца. Нябёсы. Прамення пучок…». Настаўнік можа падрыхтаваць ксеракопіі (альбо электронны варыянт) названых вершаў, зрабіўшы своеасаблівую невялікую хрэстаматыю лірычных твораў С. Дзяргая.

Падрыхтоўка да УТР (пісьмовы водгук «Маё ўспрыманне лірычных твораў») садзейнічае фарміраванню ўменняў рэпрэзентацыі ўласных назіранняў над мастацкім творам (групай вершаў) у лагічнай яе паслядоўнасці, пры дапамозе ілюстрацый з тэкстаў і паралеляў з сучасным жыццём. Паколькі СПЛ прадугледжвае не толькі фарміраванне адпаведных уменняў на вучэбную перспектыву, а і замацаванне, удасканаленне гэтых уменняў у працэсе наступных этапаў навучання, то выкананне *пісьмовага* водгуку васьмікласнікамі на этапе вывучэння лірыкі дазваляе выйсці на наступны ўзровень вучэбных дасягненняў: а) замацаванне ўменняў выканання такога віду творчай работы (паводле вучэбнай праграмы, *вусны* водгук на прачытаную кнігу павінен быў здзяйсняцца ў сёмым класе [2, с. 44]); б) фарміраванне ўменняў пабудовы пісьмовых разважанняў, доказаў, ілюстрацый, супастаўленняў – усяго таго, што спатрэбіцца вучням пры падрыхтоўцы пісьмовых сачыненняў-разважанняў па вывучаным творы ў восьмым класе.

**Першы ўрок** гэтага блока ўрокаў (паводле агульнай нумарацыі – гэта ўрок № 11 (Народныя песні)). Ва ўступнай частцы да яго (адпаведна – да ўсяго блока) варта ахарактарызаваць структуру блока і асаблівасці выхаду на СПЛ у праецыі на УДЧ і УТР. Праводзячы такую характарыстыку, варта зрабіць наступнае: а) аб'явіць дату абмеркавання твораў С. Дзяргая і, адпаведна, вызначыць найбольш эфектыўны тэрмін знаёмства з імі; б) рэпрэзентаваць крыніцы, у якіх прадстаўлены творы; в) прадставіць апераджальныя пытанні і заданні да вершаў С. Дзяргая; змест, форма пытанняў і заданняў павінны спрыяць эфектыўнай падрыхтоўцы вучнямі водгуку на гэты твор; г) вызначыць магчымыя мэты, тэмы, форму, структуру водгуку[1] дзеля таго, каб у працэсе ўспрымання твораў з раздзела «Голасам душы і сэрца» вучэбнага дапаможніка і твораў са зборніка «Чатыры стыхіі» С. Дзяргая вучні змаглі назапашваць адпаведны матэрыял да гэтага водгуку.

**УДЧ:** структура – а) уступнае слова настаўніка «Чатыры стыхіі лірыкі С. Дзяргая»; б) конкурс чытальнікаў, в) конкурс крытыкаў мастацкіх твораў; змест – а) кароткая характарыстыка настаўнікам творчасці С. Дзяргая, сэнсу назвы зборніка «Чатыры стыхіі»; б) выразнае чытанне вершаў, розных паводле іх зместу, в) выяўленне вобразных сродкаў твораў і характарыстыка іх сэнсаўтваральнай ролі ў праекцыі на творчую работу (пісьмовы водгук).

[1] Формы водгуку: 1) выступленне на чытацкай канферэнцыі, уроку; 2) ліст да сябра; 3) допіс у газету; 4) рэкламная анатацыя для кніжнай выставы і інш. Структура водгуку: 1) уступ (*звесткі пра верш (-шы): назва, час стварэння; *мэты характарыстыкі твора (-аў)); 2) асноўная частка (*тэма твора (-аў); *праблемы, з'явы, пачуцці, якія ў ім (іх) адлюстраваны; *асноўныя ўражанні і пачуцці, якія выклікае верш (-шы); *тэзісы меркаванняў, якія варта агучыць і сцвердзіць; *доказы гэтых тэзісаў пры дапамозе характарыстыкі асноўнай тэмы твора (-аў) і яго (іх) галоўнай думкі, мастацкіх вобразаў (вобраз лірычнага героя, эпітэты, метафары, параўнанні, сімвалы, адухаўленне, супастаўленні, алегорыі, паралелізм і інш.), а таксама пры дапамозе прыкладаў з тэксту (-аў); 3) заключэнне (*выніковае супастаўленне аўтарскіх адносін да праблем і з'яў твора (-аў) і аўтара водгуку; *фармулёўка значэння верша (-шаў) у пазнанні жыцця, яго з'яў і праблем. Асаблівасці працы над водгукам: 1) у працэсе чытання рэкамендаваных твораў неабходна звяртаць увагу на той сэнс у іх, які выклікае жаданне выказацца: пракаменціраваць, аспрэчыць, развіць яго, праілюстраваць прыкладамі з уласнага ці жыцця блізкіх і знаёмых людзей і інш.; 2) выбраць той верш (-шы), на падставе якога (-іх) будзе ствараецца водгук; 3) вызначыць: мэту, тэму і форму водгуку; 4) маючы на ўвазе патрабаванні да структуры водгуку, яшчэ раз прачытаць выбраны верш (-шы) і знайсці ў ім (іх) тое, што дапаможа раскрыць тэму водгуку; 5) пасля напісання водгуку неабходна яшчэ раз перачытаць верш (-шы), а потым – водгук з той мэтай, каб высветліць, *ці дастаткова ў ім доказаў, ілюстрацый для раскрыцця тэмы, *ці няма чагосьці лішняга, што не спрыяе раскрыццю яго тэмы, *ці выразнай атрымалася форма водгуку, *ці ўлічаны патрабаванні да яго; *ці не атрымаўся ў вас пераказ верша (такое не павінна быць); 6) пасля вызначэння недахопаў водгуку, неабходна іх выправіць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**УТР:** структура – а) праца з апераджальнымі заданнямі ў групах і паміж групамі (яны ўтвараюцца ў адпаведнасці з выбранымі вучнямі тэмамі водгуку); б) выкананне пісьмовага водгуку; змест – а) вусныя выказванні вучняў у адпаведнасці з апераджальнымі заданнямі і тэмамі водгуку; супастаўленні высноў вучняў па кожнай з тэматычных груп вершаў; б) індывідуальнае рэдагаванне першага варыянта водгуку, падрыхтаванага ў адпаведнасці з дамашнім заданнем да гэтага ўрока, падрыхтоўка канчатковага варыянта водгуку[1].

Прапанаваныя вышэй этапы і формы працы па СПЛ спрыяюць дасягненню наступных мэт: а) паэтапнае назапашванне неабходных для УДЧ і УТР фактаў з мастацкай літаратуры; б) фарміраванне ўменняў вобразнага выказвання на падставе ўспрымання асобных мастацкіх твораў і суаднясення іх з іншымі творамі, а таксама тэарэтычнымі крыніцамі; в) фарміраванне ўменняў супастаўляльнай характарыстыкі вобразаў, мастацкіх сродкаў і праблематыкі літаратурных твораў. Усё адзначанае садзейнічае рацыянальнай арганізацыі працы (самастойнай і на ўроку) васьмікласнікаў па СПЛ.

## Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Беларуская мова і літаратура. 8–9 кл. : прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / І. М. Саматыя [і інш.]. – Мінск : НІА : Аверсэв, 2012. – С. 32–98.
2. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура V – XI класы / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. – 127 с.
3. **Дзяргай, А.** Чатыры стыхіі : вершы, паэмы / С. Дзяргай. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 271 с.
4. **Карухіна, В. А.** Урокі беларускай літаратуры ў 8 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання / В. А. Карухіна, П. І. Лявонава, І. М. Слесарэнка. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 214 с.
5. **Лазарук, М. А.** Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, В. І. Русілка, І. М. Слесарава. – Мінск : Нац. ін-т. адукацыі, 2001. – 360 с.
6. **Макарэвіч, А. М.** Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры : урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V – VI класах / А. М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2013. – № 7. – С. 9 – 16.
7. Рэжым доступу : http://knihi.com/skola/8.html. – Дата доступу : 03.02.2014.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

[1] Тэма, структура і змест гэтага УТР могуць быць падобнымі да тых, якія прапануюцца ў дапаможніку "Урокі беларускай літаратуры ў восьмым класе…" [4, с. 80-84] альбо ў ПКТП: урок № 23 [1, с. 66].